# Арт, мажор, шэдэўры

**У канцэрце "Музычныя шэдэўры дзвюх культур", які адбыўся ў Малой зале імя Рыгора Шырмы Беларускай дзяржаўнай філармоніі, узялі ўдзел інструментальны квартэт Акадэміі мастацтваў літоўскага Клайпедскага ўніверсітэта і ансамбль "Грамніцы" Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**

Прагучалі шэдэўры беларускага песеннага фальклору і мала вядомыя беларускай аўдыторыі творы літоўскай нацыянальнай музыкі. Трэба сказаць, што мультыстылістыка стала адной са знакавых праяў "Грамніцаў". Спалучэнне традыцыйных народных вакальных манер выканання і аранжыроўкі ў сучасных стылях — асаблівасць творчага почырку ансамбля цягам амаль усяго часу яго існавання.

Сумесны канцэрт беларускіх і літоўскіх артыстаў — вынік развіцця дамовы аб супрацоўніцтве, падпісанай у 2016 годзе БДУКіМ і Клайпедскім універсітэтам. А яшчэ падзея была прымеркавана да 25-га юбілейнага фестывалю мастацкай творчасці "Арт-Мажор", які ўніверсітэт традыцыйна праводзіў вясной.

Канцэрт стаў працягам актыўнай дзейнасці ансамбля "Грамніцы" па пашырэнні і паглыбленні партнёрскіх сувязяў з мастацкімі калектывамі, грамадскімі аб'яднаннямі і культурнымі супольнасцямі розных краін. Пачатак гэтай працы быў пакладзены яшчэ ў 1990-я гады, калі ў выніку паспяховых канцэртаў "Грамніцаў" у Бельгіі, у студэнцкім Лёвене ўзнікла культурная асацыяцыя "Беларусь-Бельгія", ініцыятарам стварэння якой з бельгійскага боку сталі вядомы кампазітар і піяніст Пол Бэсэманс і музыканты ансамбля Het Brabants Volksorkest пад кіраўніцтвам скрыпача і выканаўцы на дудзе, ганаровага супрацоўніка брусэльскага музея музычных інструментаў Хуберта Бонэ. Пазней былі шматлікія выступы "Грамніцаў" у Галандыі, Францыі, Швецыі і Швейцарыі, Літве, Латвіі, Польшчы і Германіі, Паўднёвай Карэі, В'етнаме, Аб'яднаных Арабскіх Эміратах і ў рэшце рэшт у Кітаі.

З 20 па 23 мая ансамбль прымаў удзел у Днях славянскай культуры і пісьменства, якія прайшлі ў Бельску-Падляскім (Польшча), пасля прадставіў сваю творчасць у Германіі, дзе 24 мая ў Берліне ў Расійскім доме навукі і культуры прайшоў яго першы канцэрт.

**Уладзімір ЗЯНЕВІЧ,**
**прафесар кафедры народнапесеннай творчасці БДУКіМ**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ